Трэба адзначыць, што сфера ўзаемаадносін з'яўляецца скразной сярод вышэйадзначаных фактараў стабільнасці сямейна-шлюбных адносін. Яна ўплывае і на іншыя фактары.

5. Працэс самарэалізацыі – самарэалізацыя сям'і як групы, самарэалізацыя кожнага з членаў сям'і як асобы, самарэалізацыя членаў сям'і ў сям'і.

Усе пералічаныя фактары стабільнасці сямейна-шлюбных адносін узаемна ўплываюць адзін на аднаго, што з'яўляецца значнай умовай у станаўленні і развіцці маладой сям'і. Пры творчым падыходзе да вырашэння праблем, якія ўзнікаюць у адзначаных сферах, і праяўленні творчых патэнцый членаў маладой сям'і такое развіццё абяцае быць паспяховым.

*С.А.Пацыенка*

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРЫ ВЫШЭЙШАГА САСЛОЎЯ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

Вышэйшае саслоўе ў Вялікім княстве Літоўскім уяўляла закрытую супольнасць, якая знаходзілася на самым версе сацыяльнай лесвіцы. Гэтая найбольш заможная і ўплывовая катэгорыя насельніцтва была прадстаўлена магнатамі і буйной шляхтай. Умовы выжывання ў дадзенай суполцы былі дастаткова жорсткімі. Чалавеку трэба было адпавядаць шматлікім патрабаванням, каб лічыцца паўнапраўным яе членам: быць знатным па паходжанні, мець вялізныя грашовыя сродкі і зямельныя ўладанні, высокую дзяржаўную, адміністрацыйную ці вайсковую пасаду і інш.

Магнацка-шляхецкая супольнасць характарызавалася спецыфічнасцю светаўспрымання і наяўнасцю асаблівага стылю жыцця і мыслення, выразным выяўленнем чаго стала культура яе прадстаўнікоў, якая ўяўляла асобнае цэласнае ўтварэнне ўнутры агульнапрынятай культуры Вялікага княства Літоўскага. Яна была адной з чатырох субкультур (рэлігійная, свецка-арыстакратычная, народная і гарадская), якія вылучыў М.С.Каган.

Свецка-арыстакратычная субкультура ўтварылася шляхам трансфармацыі сістэмы каштоўнасцей традыцыйнай культу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ры прадстаўнікамі вышэйшага саслоўя, якое надало ёй своеасаблівую светапоглядную афарбоўку. Інакш кажучы, першасным фактарам фарміравання свецка-арыстакратычнай субкультуры з'явіўся саслоўны падзел, а дакладней, адасабленне сацыяльнага класа буйных землеўладальнікаў.

Як нам уяўляецца, культура прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім у сваім развіцці прайшла этапы зараджэння і фарміравання (канец XIII–XIV ст.), росквіту (XV– пачатак XVII ст.) і заняпаду (другая палова XVII–XVIII ст.). Першы этап характарызаваўся панаваннем вайсковай арыстакратыі, што выклікана нестабільным унутраным і знешнім становішчам дзяржавы. Умацаванне і развіццё Вялікага княства Літоўскага было ў інтарэсах не толькі вярхоўнай улады, але і астатніх землеўладальнікаў. У такіх умовах асноўным заняткам беларускіх арыстакратаў стала актыўная вайсковая дзейнасць. Вайна з'яўлялася прэстыжным высакародным заняткам, таму ў ваенных дзеяннях абавязкова ўдзельнічалі магнаты.

Вялікую ролю ў культуры першага этапу адыгрываў рыцарскі кодэкс гонару. Даследчык А.А.Кілбас адзначае, што фарміраванне кодэкса гонару прывілеяванага саслоўя адбывалася ў XIV – пачатку XV ст., і да канца XV ст. ён ужо "ўяўляў даволі сталы грамадскі інстытут" [1]. Асноўныя пастулаты кодэкса сумленна выконваліся большасцю арыстакратаў. Аднак часам здараліся выпадкі адыходу ад правіл нават у княжацкіх колах. Пры грубых парушэннях кодэкса вінаватага чакала грамадскае асуджэнне, якое летапісы данеслі да нашага часу (напрыклад, здрадніцкае забойства Кейстута яго ж пляменнікам Ягайлам). Ад асобы арыстакрата патрабавалася высакародства. Сіла рыцара накіроўвалася на ўдасканаленне навакольнага свету і таго грамадства, часткай якога ён з'яўляўся.

Адзначым, што ваяваць у XIV ст. маглі толькі здаровыя і фізічна моцныя мужчыны, бо цяжкая металічная амуніцыя (да некалькіх дзесяткаў кілаграмаў) патрабавала добрай выпраўкі. У сувязі з гэтым вялікая ўвага надавалася падрыхтоўцы воіна, якая пачыналася ў раннім дзяцінстве. Трэніроўкай для будучых воінаў быў удзел у паляванні, дзе развіваліся не толькі хуткасць рэакцыі, але і стратэгічнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мысленне.

Сімвалічнае значэнне мела для воіна-арыстакрата зброя. Яна была абавязковым атрыбутам, па якім пазнавалі чалавека. Зброя для арыстакрата была не толькі сродкам абароны, але і сведчаннем прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы. Нават праз тры стагоддзі нашэнне шаблі з’яўлялася візуальнай прыметай шляхетнасці. Добрая зброя была доказам не толькі адвагі, але і трывалага фінансавага становішча.

Асновы светапогляду арыстакратаў былі закладзены на раннім этапе існавання дзяржавы, калі галоўным заняткам іх была вайна. Культура першага этапу не знікла бяссследна. Гэта выявілася ў пераносе некаторых рудыментаў папярэдняй культуры ў новае культурнае асяроддзе.

Такім чынам, канец XIII–XIV ст. былі часам падрыхтоўкі будучага росквіту, стварэння і назапашвання формаў і традыцый культуры вышэйшага саслоўя. За гэты перыяд у беларускім грамадстве склаліся неабходныя перадумовы для станаўлення паўнацэннай арыстакратычнай культуры. Адбылося фарміраванне беларускай народнасці, практычна завяршыўся працэс станаўлення старабеларускай мовы, якая яшчэ пры Альгердзе (1345–1377) стала дзяржаўнай у Вялікім княстве Літоўскім, сфарміравалася свая пісьменнасць, выразна вызначылася структура дзяржаўнага апарату. Да гэтага часу быў створаны кодэкс гонару арыстакрата, а таксама выпрацаваны нормы паводзін прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя, якія замацаваліся ў адпаведных патрабаваннях этыкету і цырыманіяле.

Росквіт культуры вышэйшага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім прыпаў на XV – пачатак XVII ст. Пачатак росквіту азнаменаваўся значнай ваенна-палітычнай падзеяй – перамогай саюзнага войска Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства ў Грунвальдскай бітве ў 1410 г. Разгром Тэўтонскага ордэна прынёс у краіну адносны спакой, а таксама ўсведамленне і адчуванне ўласнай сілы. Значна ўзрос прэстыж вялікага князя Вітаўта, пад фактычным кіраўніцтвам якога была здабыта гэтая перамога. Пры Вітаўце, які адрозніваўся выдатнымі стратэгічнымі і дыпламатычнымі здольнасцямі, Вялікае княства Літоўскае значна пашырыла

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свае межы ў паўднёва-ўсходнім кірунку і стала дзяржавай “ад мора да мора”.

Перамога ў Грунвальдскай бітве з’явілася сведчаннем сталасці свецка-арыстакратычнай культуры. Вышэйшыя колы грамадства аказаліся здольнымі даказаць Еўропе сваю сфарміраванасць, моц. Перамога ў многім сталася вынікам дысцыпліны магнацкага саслоўя, а таксама аўтарытэту вярхоўнай княжацкай улады.

Значны ўплыў на свядомасць прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя аказала эстэтыка Адраджэння. Вялікія геаграфічныя адкрыцці паказалі чалавецтву “нябачную” частку свету. З’яўленне кнігадрукавання таксама спрыяла пашырэнню светапогляду. Найбольш заможныя колы насельніцтва атрымалі магчымасць больш лёгкага доступу да рознага роду інфармацыі. У XVI–XVII стст. пашырыліся паездкі за мяжу (асабліва ў краіны Заходняй Еўропы) для знаёмства з лепшымі дасягненнямі чалавечай дзейнасці. Магнаты Вялікага княства Літоўскага мелі дынастычныя, палітычныя, культурныя зносіны з вышэйшымі коламі еўрапейскай арыстакратыі. Яны не толькі наведвалі еўрапейскія двары, але і нярэдка прымалі замежных гасцей у сябе. У 1518 г. адбыўся шлюб вялікага князя і караля Жыгімонта І з італьянкай Бонай Сфорцай. Нельга не заўважыць значнасці гэтай падзеі, вынікам якой стала непасрэднае пранікненне ў Вялікае княства Літоўскае еўрапейскай культуры, а таксама знаёмства знаці з умовамі свецкага жыцця Еўропы.

Заняўшы ў папярэднія часы адпаведныя амбіцыям пасады, уладкаваўшы кар’еру, маючы пэўнае становішча ў грамадстве, ужо менш цікавячыся вайной, магнаты скіравалі ўвагу на ўласную асобу і добраўпарадкаванне навакольнага асяроддзя, на ўдасканаленне гаспадаркі ў сваіх латыфундыях, спосабы атрымання грашовых сродкаў, якіх патрабаваў новы свецкі лад жыцця. Найбольш заможныя магнаты пачалі клапаціцца аб уласнай “дзяржаве”.

XV– першая палова XVII ст. сталі часам гармоніі вайсковага і свецкага пачаткаў для вышэйшых слаёў беларускага грамадства. Магнаты яшчэ не страцілі навыкаў добрых ваяроў, яшчэ пачэсным заняткам лічылася вайна. Але аднача-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сова ўзрасла роля рэпрэзентатыўнасці. Пачала звяртацца ўвага на ўзровень паўсядзённага жыцця арыстакратыі, якасць і камфортнасць побыту, на жыллё, адзенне, ежу і інш. Аднак раскоша, знешнія праявы багацця яшчэ не занялі дамінуючага месца ў свядомасці магнатаў. Знешні бляск нібы адлюстроўваў унутранае высакародства і знатнасць паходжання.

Змены ў становішчы вышэйшага саслоўя Вялікага княства Літоўскага прынесла Гарадзельская унія 1413 г. Гэты сумесны польска-літоўскі сейм, на якім былі ўсталяваны ільготы для магнатаў і шляхты каталіцкага веравызнання, з’явіўся першым крокам на шляху разбурэння адноснага адзінства вышэйшага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім. У далейшым вялікія князі з мэтай дасягнення ўлады ці замацавання на троне сталі надзяляць правамі і вольнасцямі асобных прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя. У выніку арыстакраты, асабліва абдзеленыя выгодамі і абураныя няроўнасцю, пачалі аб’ядноўвацца ў палітычныя групоўкі і патрабаваць ільгот для сябе.

З узмацненнем “сепаратысцкіх” настрояў у вышэйшых колах беларускага грамадства, калі магнат паводзіў сябе ў сваіх уладаннях як незалежны манарх, магутнасць арыстакратыі пачала прыходзіць у заняпад. Адносіны паміж магнатамі сталі насіць кланавы, змоўніцкі характар.

Пачынаючы з другой паловы XVII ст., у магнацка-шляхецкім асяроддзі назіраюцца рысы крызісу. “У XVI і XVII стст. магнаты яшчэ бралі ў рукі шаблю, займаліся дзяржаўнымі праблемамі. Тады яшчэ да гэтага абавязвалі рыцарства, адвага, высакароднасць. Цяпер жа (XVIII ст.) шляхецкая эліта бавіць час у бесперапынных баляваннях і паляваннях” [2, с. 152]. Нельга сказаць, што гэткае становішча было паўсюдным, але даволі пашыраным. Некаторыя магнаты сваімі паводзінамі ганьбілі гонар і сумленне ўсяго вышэйшага саслоўя. П’янства, жорсткасць, разбэшчанасць замянілі верацярпімасць, дабрадзейнасць і цнатлівасць былых арыстакратаў. У XVIII ст. ужо выразна прасочваліся прыметы дэградацыі прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя. Адметны той факт, што росквіт і заняпад вышэйшага саслоўя адбываліся практычна адначасова з росквітам і заняпадам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

усёй дзяржавы. Лёс Вялікага княства Літоўскага цалкам залежаў ад сумлення і паводзін магнатаў і шляхты. Калі яны дбалі аб дзяржаве (займаліся ваеннай справай, загартоўкай свайго войска), пашыраліся межы і ўплыў Вялікага княства Літоўскага. Калі ж арыстакраты пачалі клапаціцца выключна аб уласных інтарэсах, дзяржава падзялілася на варожыя лагеры і групоўкі. Вялікае княства Літоўскае згубіла так патрэбнае яму ўнутранае адзінства і апынулася ў кіпцюрах прагных суседзяў.

Манархі, якія, пачынаючы са смерці Жыгімонта Аўгуста, апошняга нашчадка дынастыі Ягайлавічаў, з'яўляліся іншаземцамі, шукалі сваіх выгод у дзяржаўных пытаннях. З цягам часу ва ўсіх галінах грамадскага жыцця пераважаюць карысць і выгода. Імкнучыся акружыць сябе раскошай і камфортам, магнаты заняліся добраўпарадкаваннем сваіх уладанняў, якія практычна ні ў чым не саступалі вялікакняжацкім.

Цяпер магнату не трэба было ваяваць самому, бо замест сябе можна было паслаць войска пад кіраўніцтвам добрага военачальніка. Змяніліся і аблічча ворага, і мэты вайсковых паходаў. Калі раней прыходзілася бараніць межы бацькаўшчыны ад тэўтонцаў ды іншых чужынцаў, цяпер нярэдкасцю былі паходы на суайчыннікаў, якія ўваходзілі ў варожыя групоўкі. Узброеныя сутычкі ў Вялікім княстве Літоўскім не спыняліся нават тады, калі дзяржава знаходзілася ў стане адноснага міру з суседзямі.

Магнатам не трэба было клапаціцца аб кар'еры. Некаторыя з іх атрымлівалі пасады і званні яшчэ ў дзяцінстве, іншыя – куплялі за грошы ці за галасы на сеймах. Зразумела, што дзейнасць такіх "выбранцаў" наўрад ці была на карысць дзяржаве. У XVIII ст. значная частка прыдворных пасад былі чыста ганаровымі, тытулярнымі. "Ваявода ў ваяводстве практычна нічога не вырашаў і нават акты не падпісваў. Нічога не рабілі розныя мечнікі, падчашыя, стольнікі, канюшыя, харунжыя…Можна было дрэнна працаваць, увогуле нічога не рабіць або нават шкодзіць дзяржаве – а прывілеі захоўваліся" [2, с. 233].

Асноўным заняткам большасці прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя стала правядзенне вольнага часу, які займаў значную частку жыцця магнатаў і да якога ставіліся з вялікай увагай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Магнаты імкнуліся вылучыцца адзін перад адным, прадэманстраваць сваю незвычайную фантазію і незлічоныя багацці. На бясконцыя патокі гасцей абрушваліся балі, феерверкі, маскарады, прадстаўленні. Нярэдка такія гасцяванні доўжыліся не тое што дні, а нават тыдні і месяцы. Некаторыя магнаты, падахвочаныя пастаянным жаданнем здзіўляць, тварылі ў сваіх уладаннях сапраўдныя цуды. Так, паддаўшыся ўплыву моднага сентыменталізму, Караль Радзівіл загадаў пабудаваць у прыгарадзе Нясвіжа Альбе ідылічную вёсачку. Завітаўшыя да Радзівіла госці на некаторы час станавіліся "пейзанамі" і "пейзанкамі". Яны пераапраналіся ў сялянскае (а дакладней, псеўдасялянскае) адзенне, жылі ў маляўнічых доміках, займаліся вырошчваннем кветак і гародніны.

Свецкая ўлада ў Вялікім княстве Літоўскім не мела межаў. Наяўнасць "залатой вольнасці" давала магчымасць шляхце падпарадкоўвацца тым законам, якія яна сама і ўсталёўвала. Вялікі князь літоўскі знаходзіўся ў залежным ад шляхты становішчы. Магнаты практычна самі ўзводзілі прэтэндэнта на трон, а потым патрабавалі ад яго адпаведную плату за дапамогу. У выніку такога ўсеўладдзя з канца XVII ст. Вялікае княства Літоўскае ператварылася ў "вялікія княствы літоўскія", бо кожнае магнацкае ўладанне нагадвала асобнае княства з уласным гаспадаром, войскам, гаспадаркай і насельніцтвам.

Нестабільнае ўнутранае становішча Вялікага княства Літоўскага ў XVIII ст. аслаблялася, з аднаго боку, знешнімі вайсковымі дзеяннямі (у пачатку 1700-х гадоў краіна ўступіла ў Паўночную вайну, якая прынесла велізарныя спустошэнні), а з другога – пастаянным умяшаннем іншых краін, спачатку меўшых не вельмі дыпламатычны характар, а надалей і ўвогуле прыняўшых адкрыта захопніцкі характар. Складаная сітуацыя, у якой апынулася Вялікае княства Літоўскае ў канцы XVIII ст., закончылася падзеннем буйнейшай ва Усходняй Еўропе дзяржавы. Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) Вялікае княства Літоўскае спыніла сваё існаванне, а беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі.

Такім чынам, за пяць стагоддзяў (з канца XIII ст. да канца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XVIII ст.) свецка-арыстакратычная субкультура на беларускіх землях прайшла некалькі этапаў у сваім развіцці і ўяўляла цалкам сфарміраваную самадастатковую з'яву ў рамках традыцыйнай культуры Вялікага княства Літоўскага. Культура арыстакратаў належала вузкаму колу людзей, у руках якіх былі сканцэнтраваны практычна ўся ўлада і асноўная частка багацця краіны. Свецка-арыстакратычная субкультура мела выбраны, элітарны характар, што абумоўлівалася закрытасцю прывілеяванага саслоўя для прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп.

Варта адзначыць, што наяўнасць вялізных магчымасцей дазволіла арыстакратам, сярод якіх было шмат выдатных дзеячаў, адыграць значную ролю ў дзяржаўным, грамадска-палітычным, эканамічным, культурным жыцці краіны. Менавіта прадстаўнікі вышэйшага саслоўя былі тым прагрэсіўным рухавіком, які падштурхоўваў культуру Вялікага княства Літоўскага да далейшага развіцця. Арыстакраты з'яўляліся ідэйнымі творцамі гэтай культуры, своеасаблівымі акумулятарамі яе патэнцыялу. На жаль, з-за палітычнай і рэлігійнай раз'яднанасці беларуская арыстакратыя не здолела ўтрымаць краіну ад распаду. "Элітарная меншасць" цалкам вычарпала сябе, што прывяло ў канцы XVIII ст. да знікнення цывілізацыі Вялікага княства Літоўскага.

---

1. *Килбас А.А.* Культура привилегированного сословия на территории Беларуси в XV–XVII вв. // Вестник Белорусского государственного университета. Сер. 3. – 1998. –№ 2. – С. 6.

2. *Мальдзіс А.* Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. – Мн.: Лімарыус, 2001.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ